***І.П. Гінько***

БДЭУ (Мінск)

# КСЁНДЗ ВІНЦЭНТ ГАДЛЕЎСКІ – ДЗЯРЖАЎНЫ МУЖ І ПРАВАДЫР НАРОДУ

Праблема фарміравання нацыянальнай свядомасці актуальна сёння як і 150 год назад. Заўсёды ў асяроддзі беларускага грамадства былі людзі, якія сваё жыццё ахвяроўвалі нацыянальнай ідэі,сярод іх і кс.Вінцэнт Гадлеўскі. Ксёндз – гэта вучань Хрыста! Як кажа Біблія – Святло сусвету. І калі глядзець на кс.Вінцэнта, гэта было цалкам так, не хочацца спяваць дэферамбаў, гэта проста было засведчанна фактамі яго жыцця.

В. Гадлеўскі выдзяляў асабістым чынам, права кожнага народа на сваю родную мову. Беларускія патрыёты імкнуліся ажыцяўляць беларускую ідэі праз літаратуру, друк, нацыянальна-дэмакратычныя арганізацыі (у большасці культурна-асветніцкія). Выдатнымі лідэрамі гэтага руху, разам са свецкімі дзеячамі, былі беларускія ксяндзы. Зусім не цяжка здагадацца,які ксёндз найбольш там вылучаўся - змагар за беларускую ідэю кс. Вінцэнт Гадлеўскі.

У Артыкуле "Незалежнасць Беларусі і Каталіцкі Касцёл" (1921 г.) Вінцэнт Гадлеўскі даказваў адпаведнасць беларускага вызваленчага руху хрысціянскай ідэі. "Хай увесь беларускі народ і ўсё беларускае грамадзянства цьвёрда верыць, што паміж імі і каталіцкім Касьцёлам у справе адраджэння беларускай народнасці і дзяржаўнасці прынцыповых нязгодаў няма і быць ня можа". Ён выступаў за адзінства каталіцкіх і праваслаўных беларусаў і, як практычны крок, прапанаваў царкоўную ўнію. Не цяжка здагадацца, што такі чалавек добры філосаф, есць і доказ гэтаму факту - артыкул "Ці ксёндз можа быць дэмакратам?". Сам аўтар адказвае, што ксёндз, незалежна ад любой партыі, мае права і нават абавязаны быць дэмакратам, гэта значыць, абараняць справядлівасць і правы тых, "якія найбольш працуюць і найбольш былі дагэтуль пакрыўджаныя сучасным паўсядзённым парадкам".

Жыццё было далёка не салодкім, В.Гадлеўскага двойчы судзіў польскі суд па даносах паліцыянтаў і мясцовых шавіністаў (тады кс. Вінцусь быў

Жодзінскім пробашчам). Першы раз яго абвінавацілі ў непавазе да ўлады, але адразу ж выпусцілі, за адсутнасцю аргументаваных доказаў. Другі раз - ў распаўсюджанні "рэвалюцыйнай дактрыны". Падставай з'яўлялася заахвочванне моладзі спяваць беларускі гімн "Адвеку мы спалі...". Варшаўскі суд прысудзіў яму два гады зняволення.

Менавіта тады В. Гадлеўскі напісаў адзіны беларускі падручнік па гісторыі ранняга хрысціянства пад назваю "Гісторыя святая, або Біблейная Новага Закону" (1932). В. Гадлеўскі адлюстроўвае пераварот у сістэме каштоўнасцяў: замест сілы – любоў, замест вайны – міласэрнасць, замест славы і ўлады – пакаянне. Адначасова з працай над лекцыямі па Новазапаветнай гісторыі В. Гадлеўскі перакладаў на беларускую мову тэксты Новага Запавету - "Чатыры Евангельлі і Апостальскія дзеі" (1939г.). Неўзабаве В. Гадлеўскі заснаваў газету "Беларускі Фронт" (2.05.1936–1939, Вільня).

Падчас Другой сусветнай вайны ён быў Галоўным школьным інспектарам пры Генерал-Камісарыяце Беларусі (да 1942г.), але такім чынам вялася падпольная барацьба. У краіны з'яўляліся ўсё новыя беларускія пачатковыя, сярэднія (гімназі) і спецыяльныя школы, прафільтраваныя ад бальшавіцкай ідэалогіі, на аснове беларускай мовы і беларускай нацыянальнай ідэі.

У снежні 1942 кс. Вінцэнт Гадлеўскі быў арыштаваны. Верагодна гестапаўцы мелі звесткі пра супрацоўніцтва з савецкай разведкай. Вінцэнт Гадлеўскі быў закатаваны ў засценках гестапа без суда і адпаведнай дакументацыі працэсу. Болей ніхто з Беларускай незалежнай партыі не быў асуджаны, а гэта значыцца,што ксёндз Гадлеўскі перанёс усе катаванні і нікога не выдаў.

Кс. Вінцэнт Гадлеўскі – беларускі патрыёт, няўтомны барацбіт за вызваленне беларускага народу і утварэнне сваёй дзяржаўнасці ў духу нацыянальнай беларускай ідэялогіі.